ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама
_____________ Р.Ю.Абрамчык
_____________ 2020

II ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”

КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА

**IX клас**

| **Заданні** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **8** | **9** | **10** | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

*22 лістапада 2020 г.*

***Тэкст да заданняў 1–6.***

(1) Рака шырокая, пакуль што чыстая, трыснёг, лаза і асака абноўлена зялёныя, сонца зноў, як штогод, грэе па-летняму, і ліпа ў самай квецені, гудзе ад цямна да цямна. (2) Сяжу пад ёю ў халадку, і гуд пчаліны люба пяе ад высокай травы, да якое звісае духмянае голле, і ў самае неба, ажно тая ліпа варушыцца ўся. (3) Пчол, паважаючы працу, баяцца не трэба. (4) Можна зблізку паназіраць, як яны робяць сваё. (5) Бясконцае, нястомнае і вельмі важнае .

(6) Ліпа тут, над ракой, на ўзлессі, не адна. (7) За палянай, дзе пачынаецца белая грэчка, стаяць яшчэ чатыры такія красуні, таксама ў шчодрай духмянасці і неабсяжна (*гудзяць, гудуць*).

(8) На адной з двух бліжэйшых ліп хаваецца ў кроне буслянка. (9) Мноства разоў на дзень жыхары яе зверху абмахваюць белачорнымі крыламі зялёна-залацісты гуд, то асядаючы на гняздо, то зноў узлятаючы. (10) Сям’я з трыма падлеткамі, што яшчэ чорнадзюба хекаюць ад спёкі і, стоячы ў гняздзе, з трэвожнай цікаўнасцю разглядаюць бліжэйшае наваколле. (11) Дрэвы, раку, траву, будынкі лесніковага двара, чырвоныя, сінія, жоўтыя скрыначкі вулляў усё, над чым так добра і так яшчэ боязна (*планаваць, планіраваць, плаваць*) на няўпэўненых, радасных крылах. (12) Далей за ракою лугі, за імі каласіста-спелыя **прасторы** палёў, якія цяпер, амаль апоўдні, у парнай смузе.

**Заданне 1.** Прачытайце тэкст і напішыце адказы на пастаўленыя пытанні.

*Максімальны бал — 5.*

| Пытанні | Адказы |
|---|---|
| 1. Стыль тэксту? | |

| | |
|---|---|
| 2. Тып маўлення? | |
| 3. Сродкі сувязі? | |
| 4. Словы-сінонімы да выдзеленага ў апошнім сказе назоўніка? Падкрэсліце. | *абсяг, выпас, гоні, далеч, паша, пералескі, прыволле, разводдзе, роўнядзь, шыр.* |
| 5. Словы ў дужках, якія падыходзяць па сэнсе для сказаў пад нумарамі ***7*** і ***11***. Запішыце. | |

**Заданне 2.** Выпішыце з тэксту паслядоўна адно за другім у пачатковай форме словы, якія адпавядаюць значэнням: 1) ‘буслава гняздо’; 2) ‘лёгкая, падобная на дым атмасферная плёнка, дымка, туман’; 3) ‘вадзяная ці балотная шматгадовая расліна сямейства злакаў з раскідзістай мяцёлкай і каленчатым пустацелым або губчатым сцяблом’; 4) ‘прыемны пах, водар’; 5) ‘моцная гарачыня ў паветры, нагрэтым сонцам’.

*Максімальны бал — 5.*

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

**Заданне 3.** Выпішыце з тэксту ўказаныя адзінкі.

*Максімальны бал — 5.*

| | |
|---|---|
| 1. Словы з фанетычным падаўжэннем. Запішыце іх у пачатковай форме (1 бал). | |
| 2. Словы, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам (2 балы). | |
| 3. Фразеалагізм, які адпавядае значэнню: ‘*увесь дзень*’ (1 бал). | |
| 4. Слова з апошняга абзаца, якое складаецца з кораня і 4-ох суфіксаў (1 бал). | |

**Заданне 4.** Выпішыце з тэксту ў алфавітным парадку адзіночналікавыя назоўнікі (ужываюцца толькі ў адзіночным ліку).

*Максімальны бал — 5.*

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

**Заданне 5.** Выявіце ў тэксце 5 слоў, напісаных з арфаграфічнымі памылкамі. Запішыце іх правільна.

*Максімальны бал — 5.*

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

**Заданне 6.** Запішыце словамі парадкавыя лічэбнікі – нумары сказаў, дзе прапушчаны працяжнік. Абазначце націскныя склады.

*Максімальны бал — 4.*

______________________________________________________________________

**Заданне 7.** Суаднясіце часткі.

*Максімальны бал — 5* (0,5 бала за кожную пару)

**I.** Рускамоўныя і беларускамоўныя фразеалагізмы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў.

| | |
|---|---|
| А) попасть впросак;<br>Б) снять стружку;<br>В) у чёрта на куличках;<br>Г) без задних ног;<br>Д) два сапога пара | 1) на адзін капыл;<br>2) трапіць у нерат;<br>3) за блізкім светам;<br>4) дать прачуханца;<br>5) як пшаніцу прадаўшы |

А__Б__В__Г__Д__

**II.** Рускамоўныя выразы і іх беларускія адпаведнікі. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў.

| | |
|---|---|
| А) участник застолья, званый гость;<br>Б) вымощенная камнем дорога;<br>В) напиток из березового сока;<br>Г) страница книги, журнала газеты;<br>Д) кровельное железо. | 1) брукаванка;<br>2) балонка;<br>3) бляха;<br>4) бяседнік;<br>5) бярозавік |

А__Б__В__Г__Д__

**Заданне 8.** Запішыце часцінамоўную прыналежнасць выдзеленых слоў.

*Максімальны бал — 5.*

| | |
|---|---|
| А) Дачка адыходзіла цвёрда, **аднойчы** зірнула назад. | А) ____________________; |
| Б) **Штосьці** яго стрымлівае ад жадання прызнацца. | Б) ____________________; |
| В) **Вось** дзе можна бавіць час! | В) ____________________; |
| Г) Гэта была **вось** палітычнага жыцця краіны. | Г) ____________________; |
| Д) На ім былі штаны колеру **хакі**. | Д) ____________________ |

**Заданне 9.** Запішыце прапушчаныя тэрміны.

*Максімальны бал — 5.*

| | |
|---|---|
| 1. Невялікая камічная сцэнка, якая разыгрывалася паміж актамі асноўнага дзеяння спектакля. | |
| 2. Урачысты, узнёслы верш, хвалебная песня ў гонар важнай падзеі, з’явы, асобы. | |
| 3. Апісанне прыроды ў літаратурным творы. | |
| 4. Невялікі лірычны верш напеўнага характару пра каханне. | |
| 5. Верш з 14 радкоў, напісаных ямбам. | |

**Заданне 10.** Запішыце прапушчаныя словы ў радках-назвах вершаў і прозвішча, імя аўтара.

*Максімальны бал — 6.*

| Радок-назва верша | Аўтар верша |
|---|---|
| 1. «Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы _____________» | |
| 2. «Свяці, каханне чыстая _____________________!..» | |
| 3. «Пазвоніць аднойчы _______________________…» | |
| 4. «Трэба __________________ бываць часцей» | |
| 5. «Дзе мой край? Там, дзе вечную песню пяе ________________________________________…» | |
| 6. «Жыццё даецца, каб жыццё ___________________» | |